УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-61.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., ініцыгарод. абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Заміц тарыфу, згодна постановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надатку.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Цартсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СУБОТА, 8 сакавіка 1930 г.
№ 56 (3564)
Год выданьня—XIV.
РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

МІЖНАРОДНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ—ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН УСЯГО СЬВЕТУ, ДЗЕНЬ АГЛЯДУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ СІЛ ПРАЛЕТАРАК У БАРАЦЬБЕ ЗА СУСЬВЕТНУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ, ЗА ПЕРАМОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ Ў КРАІНЕ САВЕТАЎ, ЗА ВЫКАРЧОЎВАНЬНЕ КАРЭНЬНЯЎ КАПІТАЛІЗМУ

8-га сакавіка

Дзень 8-га сакавіка ў гэтым годзе мы праводзім у выключнай абстаноўцы, у абстаноўцы вялізарных зрухаў, як у краі будуючагася сацыялізму, так і ў краёх капіталу.

Капіталістычны сьвет перажывае выключна жорсткі эканамічны крызіс. Усё больш і больш абвастраецца клясавая барацьба. Беспрацоўе ў капіталістычных краёх дасягнула нячуванай лічбы—20 мільёнаў чал. Павялічваецца голад, галеча рабочых мас. У наяўнасьці вялізарны ўздым рэвалюцыйнага рабочага руху. Поплеч з рабочымі выступае і работніца. За 20 год, якія прайшлі ад першага міжнароднага жаночага дня, жаночы рабочы рух далёка пайшоў наперад, стаў арганічнай часткай агульнарабочага клясавага руху супроць буржуазіі. Біч капіталістычнай рацыяналізацыі мацней за ўсё б'е па работніцы. Ніколі яшчэ так сьвядома ня рвалася работніца да адзінага пралетарскага фронту супроць буржуазіі і яе агентаў—сацыял-фашыстых, як зараз.

Францускія работніцы, якія дэманстравалі ў вуліцах Кампаньні з лёзунгамі «Арганізуйце Саветы ў Францыі», польскія работніцы, якія выганялі сацыял-фашыстых са сваіх сходаў і сваімі целамі перагароджвалі дарогу штрэйк брэхэрскім трамваям, нямецкія работніцы, якія першымі забаставалі 2-га мая 1929 году, тэкстыльшчыцы Індыі, працоўныя жанчыны Гаіці, якія ахвяравалі сваё жыцьцё за вызваленьне ад імпэрыялістых—усюды працоўныя жанчыны выступалі ў адзіным рэвалюцыйным фронце пралетарыяту—мужна і стойка абаранялі яго справу.

Уздым рэвалюцыйнага рабочага руху, посьпехі сацыялістычнага наступленьня ў СССР прыводзяць у шаленства буржуазію, якая прабуе арганізаваць «крыжовы» паход супроць СССР.

Жанчыны-работніцы ў капіталістычных краёх прадэманструюць у дзень 8-га сакавіка сваю гатоўнасьць абараняць СССР, узмацняць на Захадзе барацьбу супроць імпэрыялістычнай вайны, дабіваючыся таго, каб салдаты імпэрыялістычных армій, у выпадку вайны, павярнулі сваю зброю супроць свайго сапраўднага ворага—буржуазіі.

Калі Міжнародны Жаночы Дзень у капіталістычных краёх праходзіць ва ўмовах шаленага наступленьня капіталізму, які б'ецца ў абцугох эканамічнага крызісу, ва ўмовах контр-наступленьня рабочае клясы супроць буржуазіі, дык у краі дыктатуры пралетарыяту—у СССР—8-га сакавіка ў гэтым годзе супадае з разгорнутым сацыялістычным наступленьнем.

Вялікія тэмпы індустрыялізацыі ўсяго Саюзу і нашай БССР, вялізарны працэс сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва, як класы, на аснове масавага калгаснага руху—ва ўсім гэтым актыўнейшы базавы ўздзел прымае жаночына-работніца, працоўная жанчына. Ідэі камуністычнай партыі і савецкай улады грунтоўна ўвайшлі ў сьвядомасьць значных пластоў работніц і сялянак—у гэтым адна з крыніц сілы і моцы пралетарскай дыктатуры.

Мы маем вялізарныя посьпехі на шляху ўцягваньня жанчын да актыўнага ўдзелу ў нашым будаўніцтве. Па БССР мы маем за гэты год рост ліку работніц у прамысловасьці да 40 проц. да ўсёй рабочай сілы (замест 34 проц. у мінулым годзе). Мы маем у саветах—9.304 жанчын, у каапэрацыі—11.839, у кіраўнічых органах прафсаюзаў—9.939; 122 жанчыны вылучаны старшынямі сельскіх і местачковых саветаў, 5—старшынямі і намесьнікамі РВК, 6—дырэктарамі і намесьнікамі дырэктароў фабрык і заводаў.

Посьпехі вялікія, але яны невыстарчальны для выкананьня тых грандыёзных задач, якія стаяць перад намі. Патрэбна патраеньне, удзесяцярэньне актыўнасьці ўсіх работніц, усіх працоўных сялянак, патрэбна больш сьмелае і шырокае вылучэньне іх на кіраўнічую работу ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на кожным прадпрыемстве і на кожным заводзе—сюды павінны быць накіравана ўся энэргія работніц нашых прадпрыемстваў. 1929-30 год гэта вузлавы, хрыбтавы год нашай пяцігодкі. У дзень 8-га сакавіка воля і энэргія работніц павінна быць мабілізавана наўкола павялічэньня прадукцыі, наўкола зьніжэньня сабекошту, наўкола паляпшэньня якасьці прадукцыі. Ні адна работніца не павінна быць у баку ад сацыялістычнага спаборніцтва, ад ударнага руху. Мы ня маем яшчэ дагэтуль ва ўдарных брыгадах на нашых заводах і фабрыках такой колькасьці работніц, якую мы маглі-бы мець пры наяўнасьці напружанай работы з боку адпаведных партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Даволі сказаць, што на ўсесаюзным зьезьдзе ўдарнікаў жанчын усяго было 12,7 проц. У дзень 8-га сакавіка трэба сканцэнтраваць увагу на ўзмацненьні ўдзелу жанчын ва ўдарніцкім руху, у сацспаборніцтве, у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Асабліва вялікія задачы стаяць перад жаночай працоўнай масай вёскі. Бурныя тэмпы калектывізацыі сталі магчымымі толькі таму, што найшырэйшыя масы бяднацка-серадняцкага сялянства зразумелі на практыцы, упэўніліся ў правільнасьці генэральнай лініі партыі, узяўшы курс на карэнную перабудову сваёй адсталай індывідуальнай гаспадаркі.

На аснове тых посьпехаў, якія мы мелі ў калектывізацыі, наша партыя перайшла ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Правядзеньне ў жыцьцё грандыёзнага пляну сацыялістычнае перабудовы вёскі і выкарчоўваньня каранёў капіталізму патрабуе напружанай энэргіі ўсяго рабочае клясы і бяднацка-сераднацкіх мас сялянства. Работніца і працоўная сялянка прымаюць у гэтай перабудове актыўнейшы ўдзел. Мы маем зараз на вёсцы вялізарны жаночы актыў, які арганізуе жаночую масу на дапамогу партыі і ўраду ў сацыялістычнай перабудове вёскі. Мы маем сотні і тысячы перадавых бяднячак і батрачак у радох авангарду рабочае клясы, у радох камуністычнае партыі. Сялянкі-актывісткі ўпарта і настойліва змагаюцца з перагібамі, невуцтвам, з адсталымі адносінамі да жанчын, пракладаючы для ўсяе працоўнае жаночае масы шырокі шлях да ўдзелу ў грамадзка-палітычным жыцьці краю. Асноўная задача заключаецца ў тым, каб уцягнуць **усю масу** працоўных сялянак у калгасы і **ўсю масу калгасьніц** ва ўсе галіны сельскае гаспадаркі, каб дабіцца ў калгасах роўнай аплаты за адналькавую працу, каб стварыць новыя ўмовы быту.

Мы маем на вёсцы яшчэ і дагэтуль масы адсталых жанчын, якія яшчэ не разумеюць усіх пераваг новых сацыялістычных форм зямляробства, якія часамі перашкаджаюць сацыялістычнай перабудове вёскі, якіх кулак прабуе выкарыстаць у сваіх мэтах. Адна з галоўных задач заключаецца ў тым, каб праз жаночы вясковы актыў, праз перадавікоў-жанчын перавыхаваць гэтую масу, перацягнуць яе на правільны шлях, на шлях пралетарыяту і яго партыі, на шлях арганізацыі калгасаў. З асаблівай сілай у дзень 8-га сакавіка трэба высунуць задачы па ахове **мацеры і дзяцей ў калгасах.** У гэты дзень павінна быць сканцэнтравана ўвага на арганізацыі ў калгасах дзіцячых устаноў, грамадзкіх сталовых. Органы аховы здароўя, народнай асьветы павінны накіраваць сваю ўвагу на палепшаньне існуючых устаноў, на арганізацыю новых, памятаючы, што ўсё гэта будзе садзейнічаць далейшаму разьвіцьцю і ўмацаваньню калгасаў і большаму ўцягненьню працоўных жанчын у іх.

Нам трэба з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне аб узмацненьні вярбоўкі ў партыю перадавых работніц і батрачак. Лічбы, якія ёсьць у нас, гавораць аб тым, што ў нас у БССР, ня ўсё добра з работай па вярбоўцы ў партыю работніц і батрачак. Мы маем на 1-га студзеня 1930 г. у КП(б)Б—4.548 чалавек, ці 12,5 проц. усяго складу КП(б)Б у той час, калі адных работніц па цэнзавай прамысловасьці налічваецца 40 проц. у адносінах да ўсяе рабочае сілы. Па сацыяльным складзе мы маем: 48,7 %—работніц, 8,7 проц.—сялянак, 3,7 проц.—батрачак і 42,6 проц. служачых. 1929 год даў пералом у адносінах вярбоўкі ў партыю работніц. Ён паказаў, што мы маем вялізарныя магчымасьці для росту партыі за лік жанчын-работніц і батрачак. За адзін чацьверты квартал 1929 г. прынята 259 жанчын, з якіх 81,9 проц. работніц. Гэта гаворыць за тое, што пры правільнай пастаноўцы работы на прадпрыемствах і сярод батрачак мы здолеем значна павялічыць рады КП(б)Б за лік лепшых работніц.

У міжнародны жаночы дзень трэба яшчэ больш мабілізаваць усю жаночую масу вёскі вакол ажыцьцяўленьня важнейшых задач нашай партыі: на барацьбу з кулаком, на далейшае пашырэньне калгаснага руху, на ўздым культурнага ўзроўню працоўных сялянак, на большае ўцягненьне іх у актыўную савецкую і грамадзкую работу.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК рабочая кляса і бяднацка-сераднацкае сялянства дабіліся рашаючых посьпехаў у галіне сацыялістычнай перабудовы ўсёй народнай гаспадаркі. На аснове жалезнага адзінства нашай партыі, на аснове бязьлітаснай барацьбы з правымі і «левымі» апартуністымі, на аснове мацнейшай сувязі партыі з рабочай клясай мы здолелі дабіцца гэтых посьпехаў. У дзень 8-га сакавіка работніцы, батрачкі і працоўныя сялянкі прадэманструюць сваю гатоўнасьць да далейшай барацьбы за ленінскую лінію партыі.

Па закліку кампартыі 6-га сакавіка мільёны пралетараў усяго сьвету вышлі на вуліцу

КРЫВАВЫЯ БАІ НА ВУЛІЦАХ ДЭТРОЙТУ, НЬЮ-ЁРКУ, ПРАГІ, НЭЙКЁЛЬНУ

Пад знакам контр-наступленьня і наступленьня

Міжнародны чырвоны дзень барацьбы з беспрацоўем асабліва выразна выявіў узрастаючую волю міжнароднага пралетарыяту да барацьбы.

Ня гледзячы на тое, што міжнародны фашызм і сацыял-фашызм мабілізаваў усе свае сілы для таго, каб не дапусьціць да рэвалюцыйнага выступленьня рабочых—мільённыя масы рабочых і беспрацоўных вышлі на вуліцу ва ўсіх кутках зямнога кулі, паліцыя ўсюды разганяла гэтыя дэманстрацыі. Рабочыя масы аказвалі заўзята супраціўленьне паліцыі, адбыліся крывавыя сутычкі. Былі працяжныя баі з паліцыяй, барыкадныя баі ў Нэйкельне. Паліцыя расстрэлівала рабочых, ёсьць сотні ахвяр, тысячы арыштаваных, але ня гледзячы на гэта рабочыя масы заваявалі вуліцу.

Асабліва зварачаюць на сябе нашу ўвагу падзеі ў ПАЗШ: вялізарныя дэманстрацыі рабочых, падобных якім ня было яшчэ ў гісторыі Амэрыкі (70-тысячная дэманстрацыя ў Нью-Ёрку, 150-тысячная дэманстрацыя ў Дэтройце і г. д.), крывавыя бой вялізарных рабочых мас з паліцыяй у Дэтройце—у сэрцы амэрыканскай аўтамабільнай прамысловасьці ў вотчыне Форда.

Гэтыя падзеі сьведчаць аб рэвалюцыйным пераломе ў настроях амэрыканскіх рабочых і зьяўляюцца характэрнымі для пэрыяду нарастаючага рэвалюцыйнага ўздыму і гаворыць аб тым, што пралетарыят пераходзіць ня толькі да контр-наступленьня, але і да наступленьня на крэпасьці капіталізму.

Трэба адзначыць той факт, што ўсюды на чырвоных штандарах рабочых дэманстрацый быў напісаны лёзунг: «Абараняйце Савецкі Саюз».

Міжнародны чырвоны дзень барацьбы з беспрацоўем зьяўляецца вялікаю перамогаю камуністычнае партыі над фашызмам і сацыял-фашызмам. Камуністычныя партыі ў капіталістычных краёх яшчэ больш напрудзяць свае сілы і энэргію, каб кіраваць рабочымі масамі, якія ўсё больш рэвалюцыянізуюцца, на рашучы штурм капіталізму, на непасрэдную барацьбу за дыктатуру пралетарыяту.

Будапэшт прадстаўляў ваенны лягер

ВЕНА, 6. Як паведамляюць з Будапэшту ужо апошнімі днямі перад 6 сакавіка Будапэшцкая паліцыя арыштавала звыш 1.000 рабочых, якія катуюцца з мэтаю, каб прымусць іх даць паказаньні аб арганізатарах выступленьня беспрацоўных, назначанага на 6-га сакавіка. Сёньня Будапэшт мае выгляд ваеннага лягеру. Па вуліцах ходзяць паліцэйскія патрулі, узброеныя вінтоўкамі.

100-тысячная дэманстрацыя ў Дэтройце, 70-ці тысячная ў Нью-Ёрку

Паўтарагадзінны бой на вуліцах Дэйтройту

НЬЮ-ЁРК, 6. А першай гадзіне дня на пляцы «Юніён-Сквэр», каля памяшканьня кампартыі, сабралася звыш 30.000 рабочых. Усе навуковыя вуліцы запоўнены рабочымі. Накіроўваючыся да пляцу, рабочыя пяюць «Інтэрнацыянал». Недалёка ад «Уніён-Сквэр» знаходзіцца вялізарны атрад паліцыі (у 5.000 чалавек), узброены кулямётамі і бомбамі, якія выклікаюць сьлёзы, і забясьпечаны бранёванымі матацыклямі. Паліцыя заяўляе, што яна не дапусьціць паходу да будынку муніцыпалітэту.

Да 2-х гадзін дня сабралася каля 70.000 чалавек. Усюды плякаты з лёзунгамі — «Хлеба або работы». На будынку, дзе знаходзіцца кампартыя, разьвяецца вялізарны чырвоны сьцяг з заклікам **«Стварайце саветы беспрацоўных».**

А палове трэцяй, ня гледзячы на адмову паліцыі дазволіць паход да будынка муніцыпалітэту дэманстранты выстраіліся радамі і рушылі наперад. Паліцыя з палкамі кінулася ў атаку на рабочых. На пляц хутка прыбываюць паліцэйскія падмацаваньні. Пусьціўшыя ў ход гумовыя палкі і брандзбой, паліцыя дзейнічала з выключнай жорсткасьцю. **Ранена больш 100 дэманстрантаў.** Параненыя затрыманы і дастаўлены ў турэмную больніцу. Паліцыя арыштавала кіраўнікоў кампартыі ПАЗШ і рэвалюцыйнай лігі прафсаюзнага адзінства **Фостэра, Майнэра, Зыскіна і Амтэра.** Сярод паліцэйскіх паранены адзін.

Пасьля разгону дэманстрацыі на Юніён-Сквэры, 15.000 рабочых зноў наладзілі дэманстрацыю каля памяшканьня кампартыі.

Паводле паведамленьня агенцтва «Асоціэйтэд Прэс», у цэнтры аўтамабільнай прамысловасьці, у **Дэтройце,** у дэманстрацыі прымала ўдзел 100.000 чалавек. Паліцыя напала на дэманстрантаў. Дэманстранты аказалі рашучае супраціўленьне. **Завязаўся бой, які працягваўся капя паўтары гадзіны.** Паліцыі з вялікаю цяжкасьцю ўдалося разагнаць дэманстрантаў, якія занялі пляц перад муніцыпалітэтам і важнейшыя вуліцы гораду. У часе сутычак параненa 12 чалавек. Арыштавана 27 дэманстрантаў.

Дэманстрацыі адбыліся ў **Вашынгтоне** і ў галоўных прамысловых цэнтрах: **Устэрбэры, Стэмфордзе, Вустэры, Буфало, Пітсбургу** і інш. гарадох. Паліцыя разганяла дэманстрацыі, якія накіроўваліся да будынкаў муніцыпалітэтаў гэтых гарадоў, многа рабочых арыштавана. Вялікія мітынгі адбыліся таксама ў **Філядэльфіі, Кліўлэндзе** і інш. гарадох.

Масавыя дэманстрацыі адбываліся і ў **паўднёвых** штатах, дзе яшчэ год таму назад уплыў кампартыі быў вельмі слабым. Рабочыя негры і белыя арганізавалі сумесныя дэманстрацыі ў цэнтры тэкстыльнай прамысловасьці — **Шарлёце** (штат Паўночная Караліна), **Фортуорце, Хаўстоне** (штат Цэхат) і ў іншых паўднёвых гарадох. У **Кліўлэндзе** ў дэманстрацыі прымала ўдзел 15.000 чалавек. Узброеная да зубоў паліцыя напала на дэманстрантаў. Шмат параненых. Паводле слоў буржуазнай «Асоціэйтэд Прэс» дэманстрацыя, што адбывалася ў Гастоне, была самай вялікай з усіх, якія адбываліся ад часу накараньня сьмерцю Сако і Ванцэці.

Расстрэл рабочых дэманстрацый у Празе

ПРАГА, 6. У многіх гарадох Чэха-Славакіі адбыліся сумесныя дэманстрацыі беспрацоўных і працуючых. **Усюды адбываліся жорсткія сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцыяй,** якая па іх нападала. Асабліва бурны характар прынялі сутычкі ў Габлонцы, дзе **жандармэрыя страляла ў рабочых.** Паранена 17 дэманстрантаў. Арыштавана шмат рабочых, сярод іх два паранены. **Цэнтр Прагі ўжо з раніцы абярнуўся літаральна ў ваенны лягер.** Разьязджаюць грузавікі з узброенай паліцыяй. У завулках, якія падыходзяць да цэнтру, былі наладжаны засады з соцень паліцэйскіх і жандараў, узброеных вінтоўкамі з прымкнутымі штыхамі. У паліцэйскіх і жандарскіх казармах пастаянная баявая трывога. Паліцыя, якая знаходзілася ўсюды «напагатове», неадкладна арыштоўвала ўсякага, хто прабаваў зьвярнуцца з прамоваю да дэманстрантаў, рашуча разганяючы найменшыя натоўпы на вуліцах. У Празе на працягу дня адбыліся 3 выступленьні. Арыштаваны рад камуністычных прамоўцаў.

Барыкадныя баі ў Нэйкельне

БЭРЛІН УПЯРШЫНЮ БАЧЫЎ ТАКУЮ ВЯЛІЗАРНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ САЛІДАРНАСЬЦІ

БЭРЛІН, 7. На заклік кампартыі арганізаваць масавыя вулічныя дэманстрацыі адгукнуліся, ня гледзячы на забарону, дзесяткі тысяч рабочых Бэрліна. Амаль бесьперапынна адбываліся сутычкі з паліцыяй, якая прабавала разагнаць дэманстраўючых рабочых з дапамогаю гумовых палак. Да вечара адзін рабочы быў забіты, 12 цяжка паранены, шмат лёгка паранены і 115 арыштавана. Паліцыя паведамляе, што пацярпела 13 паліцэйскіх.

Учора вечарам мелі месца вялікія дэманстрацыі ў **Мюнхэне.**

БЭРЛІН, 7. Дэманстрацыі ў многіх пунктах Бэрліна працягваліся амаль да наўночы. У Нэйкельнскім раёне, які вядомы крывавымі падзеямі ў майскія дні 1929 году, рабочыя, абараняючыся супроць паліцыі, паваялі ліхтары і зрабілі барыкады.

«Ротэ Фанэ» друкуе прозьвішчы 15 рабочых, у тым ліку 3-х жанчын, параненых выстраламі з рэвальвэраў.

У акрузе **Ніжняга Рэйну** ў дэманстрацыі прымала ўдзел 35-40 тысяч рабочых, арыштавана больш 300 рабочых. Лік арыштаваных па ўсёй Нямеччыне значна перавышае 1.000 чалавек, прычым амаль усе яны збіты гумовымі палкамі.

Па ўсёй Польшчы адбыліся масавыя дэманстрацыі

ПРАВАКАЦЫЯ АГЕНТАЎ ДЭФЭНЗЫВЫ Ў ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 7. Самая вялікая дэманстрацыя адбылася на банкаўскім пляцы вечарам. Адсюль рабочыя ў колькасьці 3.000 пасьля мітынгу, на чале з камуністычным дэпутатам **Жарскім,** накіраваліся да турмы Павяк, дзе сядзяць палітзьняволеныя. На пляцы паліцыя кінулася на Жарскага з прыкладамі, але, дзякуючы рашучаму адпору дэманстрантаў, вымушана была адмовіцца ад расправы.

У Катавіцах адбылася дэманстрацыя на чале з дэпутатам Кэрэўальскім.

У **Домбраве** першая спроба дэманстрацыі больш 7-мі тысяч рабочых была жорстка задушана паліцыяй. Было зьбіта і патаптана паліцэйскімі коньмі шмат рабочых. Маса аказала ўпартае супраціўленьне паліцыі.

У **Радоме** паліцыя аказавала дэманстрантаў, на чале якіх знаходзіўся дэпутат — член камфракцыі Гаўрон.

У **Лодзі** паліцыя дэманстрацыі не дапусьціла.

Сутычкі з паліцыяй у Лёндане і Манчэстэры

ПАРАНЕНЫ ЧЛЕН ЦК КАМПАРТЫІ ПОЛІТ

ЛЁНДАН, 6. Пачынаючы з 10 гадзін раніцы групы беспрацоўных насоўваюцца з далёкіх кварталаў Лёндану да цэнтру.

Паліцэйскія з гумовымі палкамі кінуліся на дэманстрантаў. 6 дэманстрантаў паранены. Двое з іх дастаўлены ў шпіталь. **Лёгка паранены член ЦК кампартыі Дарый Політ.**

У **Манчэстэры** паміж рабочымі, якія дэманстравалі і паліцыяй завязалася сутычка. Арыштавана 7 рабочых. Чакаюцца далейшыя арышты.

Аб становішчы ў Гомельскай партарганізацыі

Пастанова парткалегіі ЦКК УсеКП(б) ад 23 лютага 1930 г.

(*Па тэлефону ад нашага маскоўскага карэспандэнта*)

1. Ухваліць меры, прынятыя ЦК і ЦКК КП(б)Б у справе выпраўленьня апартуністычных памылак Гомельскага акругкому КП(б)Б.

2. Канстатаваць у той-жа час, што рад выяўленых памылак не знашоў своячасовага выпраўленьня з боку вышэйшых кіруючых парторганаў Беларусі.

3. Прыняць да ведама заяву тав. Калніна, што тав. Малаковіч адазваны з Гомельскай арганізацыі і што пленумам Гомельскага акругкому гэта пастанова праведзена ўжо ў жыцьцё.

4. Зьвярнуць увагу ЦК і ЦКК КП(б)Б на выяўленыя факты няправільнага ўмяшальніцтва Гомельскай партарганізацыі ў судовыя справы, наперакор пастанове партыі, якая мелася па гэтым пытаньні.

Зьмяшчаючы пастанову ЦКК УсеКП(б) і пастанову ЦК і ЦКК КП(б)Б, рэдакцыя газэты «Правда» са здавальненьнем канстатуе, што ЦК і ЦКК Беларусі, хаця і з некаторым спазьненьнем, прынялі рашучыя меры да аздараўленьня Гомельскай арганізацыі і да абнаўленьня партыйнага кіраўніцтва, якое дапусьціла рад буйных апартуністычных памылак.

ЗА ХУТЧЭЙШЫ ПЕРАВОД КАЛГАСАЎ НА НОВЫ СТАТУТ

Апублікаваны падаўна прыкладны статут с.-г. арцелі мае вялізарнае палітычнае значэньне. Ён намячае галоўныя шляхі, на якіх у далейшым павінен пайсьці калгасны рух. Ён зазначае тое **асноўнае, за што трэба ўхапіцца,** каб дасягнуць хутчэйшага і больш лёгкага ўзмацненьня існуючых калгасаў. Новы статут—баявая праграма дзеяньня для нашых пасьпяховых і савецкіх арганізацый.

Статут ясна і выразна паказвае, што с.-г. арцель—асноўная для данага адрэзку часу форма калектыўнае гаспадаркі. Ні таварыства па супольнай апрацоўцы зямлі, дзе не абагульваюцца сродкі вытворчасьці, ні с.-г. камуна, дзе абагульваецца і спажываньне, а с.-г. арцель, дзе калектывізуецца зямлякарыстаньне, сродкі вытворчасьці, рабочая і таварна-прадукцыйная жывёла.

Камуна—вышэйшая форма калектыўнае гаспадаркі, мета, да дасягненьня якой мы павінны імкнуцца. Але для стварэньня камуны патрэбны адпаведныя прадпасылкі, патрэбна папярэдняя вялікая работа. С.-г. арцель—адзін з этапаў калгаснага руху, прайшоўшы які мы ўпэўнільную падыйдзем да вышэйшай формы калектыўнае гаспадаркі—камуны. **Праз гэты этап нельга пераскочыць.** Забываючы аб гэтым, мы можам дабіцца папярэдняя камун замест сапраўдных арцелей.

Безумоўна, у асобных мясцох ёсьць ужо зараз адпаведныя ўмовы для стварэньня камуны. Падзеі [illegible] няма. Вось чаму статут адзначае, што арцель—галоўная пераважная частка калектыўнае гаспадаркі. Вось чаму партыя так рэзка выступае супроць «галавакружэньня ад посьпехаў», супроць звальваньня ў кучу розных форм калгасаў, супроць недаўліку канкрэтных умоў сапраўднасьці.

Зараз ставіць як асноўную для БССР задачу—арганізацыю камун і абагульнае не ўсяе жывёлы—значыць забыць аб самым важным, забыць аб неабходнасьці ўзмацняць сувязь з масай, не адрываца ад яе.

Прыкладны статут с.-г. арцелі ставіць у аснову ўзьняцьце таварнасьці калгасаў, прадукцыйнасьці працы ў іх. Статут патрабуе абагуленьня вытворчасьці. **Таму трэба ўсе сілы, усе сродкі, усю энэргію накіраваць на абагуленьне сродкаў вытворчасьці рабочае і таварна-прадукцыйнае жывёлы.** Гэта—важнейшы і адказьнейшы вучастка нашага сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы. Узмацненьне калгасаў, пасьпяховае правядзеньне пасэўнай кампаніі, далейшае прасоўваньне наперад не магчыма без безадкладнага вырашэньня гэтай задачы.

Мы павінны канстатаваць, што ня ўсюды яшчэ і ня ўсімі ўсьвядомлена важнасьць абагуленьня асноўных сродкаў вытворчасьці ў калгасах. Калі са стварэньнем пасевных фондаў справа ідзе больш-менш здавальняюча (выкананне 87,7 проц. заданьня), дык абагуленьне [illegible] кавіка відаць, што да гэтага часу абагулена 36,6 проц. **За апошнюю дэкаду зроблена вельмі мала.** Колькасьць абагуленае рабочае жывёлы **павялічылася толькі на адзін проц.** Між тым да слуды засталося мала часу, лічаныя тыдні. Між тым, да пачатку палявых работ уся рабочая жывёла павінна быць абагулена поўнасьцю.

Гэты нездавальняючы ход абагуленьня рабочае жывёлы тлумачыцца часта тым, што ў некаторых мясцох забылі аб галоўным, асноўным. Замест таго, каб націснуць на абагуленьне сродкаў вытворчасьці, рабочае і таварна-прадукцыйнае жывёлы,—замест гэтага прабавалі абагуліць усё, аж да сьвіней, авечак і птушак. Не згуртаваўшы ўвагі на важнейшыму вучастку работы, распылілі свае сілы, сваю энэргію. У выніку, у радзе месц прабавалі пераскочыць праз арцель і не ўзамцнілі калгасы, а наадварот абъектыўна садзейнічалі іх паслабленьню.

Статут с.-г. арцелі дае выстарчальны адказ, які не дапускае ніякіх тлумачэньняў у пытаньні, што трэба абагульваць.

У пункце 4-м, 3-га разьдзелу гаворыцца: **«Абагульваецца ўся рабочая жывёла, с.-г. інвэнтар, уся таварна-прадукцыйная жывёла, усе насенныя запасы, кармавыя сродкі ў разьмерах, неабходных для ўтрыманьня абагуленай жывёлы, гаспадарчыя будынкі, неабходныя для вядзеньня арцельнай гаспадаркі і ўсе абагульваюцца. Пры абагуленьні с.-г. інвэнтару пакідаецца ў асабістым карыстаньні членаў арцелі дробны с.-г. інвэнтар, патрэбны для работы на сядзібнай зямлі. У аднакароўных гаспадарках малочная жывёла не абагульваецца. У шматкароўных гаспадарках пакідаецца ў асабістае карыстаньне адна карова, а рэшта абагульваецца... Абагуленьне дробнай жывёлы, г. зн. сьвіней і авечак, робіцца ў раёнах разгорнутае прамысловасьці жывёлагадоўлі па дробнай жывёле, пры чым пакідаецца ў членаў арцелі некаторая колькасьць дробнай жывёлы ў разьмерах, устаноўленых арцельлю. У раёнах непрамысловай дробнай жывёлагадоўлі сьвіньні і авечкі не абагульваюцца. Хатняя птушка не абагульваецца».**

Мы ўступілі зараз у самы адказны пэрыяд падрыхтоўкі да весьнавой пасэўнай кампаніі. **Нельга ўпускаць ні воднага дня.** Пазасталыя тыдні мы павінны **максымальна выкарыстаць для арганізацыйнага ўзмацненьня калгасаў.**

Таму неабходна безадкладна правесьці шырокую папулярызацыю статуту сярод бяднацкасераднацкіх мас. **Трэба паскорыць перавод калгасаў на новы статут. НЕАБХОДНА ЗАРАЗ-ЖА ПАЧАЦЬ АБГАВАРЭНЬНЕ СТАТУТУ НА СХОДАХ КАЛГАСЬНІКАЎ.**

Нашы партыйныя арганізацыі павінны ўзяць на сябе ініцыятыву і кіраўніцтва гэтай справай. Яны павінны быць на чале барацьбы з перагінаньнямі [illegible] і [illegible] план чысткі савецкага апарату [illegible]

Лука ўсіх членаў ЦКК абавязкова.

У бліжэйшых нумерах Зьвязды» будзе зьмешчаны **доклад т. Д. З. МАНУІЛЬСКАГА на пашыраным прэзыдыуме ЦККІ «Аб сусьветным эканамічным крызісе, забастовачнай барацьбе і беспрацоўі».**

На 10 сакавіка 1930 году скліканьне

чарговы пленум ЦКК КП(б)Б

з наступным парадкам дня:

1. Даклад Полацкай АКК (дакладчык т. ЭГЛЕ, сэкдакладчык т. КАЛНІН)
2. Аб масавай рабоце ЦКК-РСІ (дакл. т. ЛАЗОЎСКІ).
3) Вынікі чысткі савецкага апарату па трох Наркаматах—НКЗ, Нарк[illegible] і [illegible] плян чысткі савецкага апарату (дакл. т. Рывкін).

Бяз удзелу працоўных жанчын-сацыялізму не пабудуем

Задачы жанчыны ў абароне краю

Сусьветная буржуазія вельмі сьпяшаецца з надрыхтоўкаю чарговага нападу на Савецкі Саюз. Гэта прымушае нас быць больш пільнымі і зьвярнуць больш увагу на справу ўзмацненьня абароназдольнасьці краю.

Гэтая справа павінна стаць агульнай для ўсіх працоўных, у тым ліку і працоўных жанчын.

Пры набліжэньні новае вайны, задачай работніц і сялянак зьяўляецца надрыхтоўка да кіраваньня вытворчасьцю на фабрыках і заводах на выпадак замены сабою мужчын, у часе мабілізацыі іх на фронт, умець паставіць вытворчасьць так, каб яна ня кульгала.

У часе нападу на Савецкі Саюз работніца і сялянка павінна будзе ня толькі добра працаваць у тыле, але і ўмець уладаць вінтоўкаю, кулямётам і супроцьгазам.

У будучай вайне прыме ўдзел увесь край. Таму работніца і сялянка да гэтага павінна быць надрыхтавана.

Арганізацыі Асоавіяхіму, у зьвязку з днём 8-га сакавіка, павінны яшчэ больш узмацніць і пашырыць практычныя дасягненьні, якія ўжо мы маем у гэтай галіне.

Па 7 акругах БССР у арганізацыях Асоавіяхіму налічваецца 31.000 жанчын. Сотні жанчын ахоплены рознымігурткамі і курсамі, дзе навучаюцца вайсковай справе.

Па 3-х акругах (Ворша, Віцебск, Полацак) гурткамі вайсковых ведаў першай ступені ахоплены 673 жанчыны, другой ступені—491 жанчына. Паветрана-хэмічнымі гурткамі (па гэтых-жа акругах) ахоплена 327 чал., стралковымі—727 чал.

Па 7-мі акругах на курсах сувязі займаюцца 389 жанчын. На курсах адміністрацыйна-гаспадарчай службы знаходзіцца 325 жанчын. У хэмічных камандах і атрадах па 5-ці акругах налічваецца 1.421 жанчына. Полацкія паліт.-асьветныя курсы рыхтуюць 40 кіраўніц чырвонаармейскіх бібліятэк. Праз лягеры ў 1929 годзе прайшло 57 жанчын, якія прымалі ўдзел ня толькі, як дапаможныя службы, але і як стральцы-байцы.

Гэтага мала. З лічбаў відаць, што актыўнай работай па вазнаёмленьню занята прыблізна толькі каля 10 проц. жанчын членаў Асоавіяхіму.

Масавая работа сярод сялянак-калгасьніц і хатніх гаспадынь у гарадох яшчэ дастаткова не разгарнулася. Гэта ўсё яшчэ слабы участак работы Асоавіяхіму. У першую чаргу трэба разгарнуць работу з сялянкамі па барацьбе са шкоднікамі сельскае гаспадаркі, хатнімі паразытамі. Гэта дапаможа паступова ўцягваць жанчын у практычную работу па ўсебаковай вазнаёмленьню, улічваючы, што ў першую чаргу сялянкі і хатнія гаспадыні павінны навучыцца, як зрабіць першую дапамогу ў часе хэмічнага нападу, умець ахоўваць ад газаў сваю гаспадарку і дзяцей.

Работніца і сялянка ў часе вайны павінна стаць пэўнай дапамогай Чырвонай арміі і для гэтага шмат яшчэ што трэба зрабіць.

Арганізацыі Асоавіяхіму свой мэтад работы ад «кампаніі да кампаніі» павінны ліквідаваць, уводзячы замест яго сыстэму пасьлядоўнасьці і настойлівасьці. Гэта дасьць магчымасьць згуртаваць моцны працаздольны жаночы актыў і надасьць больш папулярнасьці і аўтарытэту арганізацыям Асоавіяхіму.

Работніца і сялянка, узмацняй абароназдольнасьць краю, уступай у рады Асоавіяхіму, вучыся вайсковай справе і будзь гатовай на першым выкліку савецкага ўраду зьявіцца на ахову Кастрычніцкіх заваёў.

Вараб'ёва.

У РАДЫ КП(б)Б

—перадавых работніц, батрачак, с.-г. работніц і лепшых бяднячак-калгасьніц

КП(б)Б за апошнія два гады дабілася бясспрэчных посьпехаў па вярбоўцы ў свае рады перадавых работніц, батрачак і с.-г. работніц. Дынаміка росту КП(б)Б з усёй відавочнасьцю сьведчыць аб пасьлядоўным павялічэньні ў складзе КП(б)Б праслойкі работніц, с.-г. работніц, батрачак і г. д.

На 1-ае студзеня 1928 году ў радох КП(б)Б было 3.442 жанчыны, або 11,7 проц. усяго складу партыі. За год з 1-га студзеня 1928 году па 1-ае студзеня 1929 году КП(б)Б папоўніла свае рады за лік жанчын на 486 чал. З 1-га студзеня 1929 году па 1-га студзеня 1930 году лік жанчын у КП(б)Б узрастае на 620 чал. На 1-ае студзеня 1930 году ў радох КП(б)Б налічваецца 4.548 жанчын, або 12,5 проц. усяго складу КП(б)Б. Рост КП(б)Б праходзіў, галоўным чынам, за лік пралетарскіх кадраў працоўных жанчын.

Работніцы ў КП(б)Б

На 1 студзеня 1929 году ў КП(б)Б было 1.659 работніц і 399 сялянак. На 1 ліпеня 1929 году колькасьць работніц дасягнула 1.932. На 1 студзеня 1930 году — 2.213. Праслойка работніц, с.-г. работніц і батрачак на 1 студзеня 1930 году складае звыш 50 проц. Вось вынікі двухгадовай работы КП(б)Б па вярбоўцы ў свае рады новых кадраў работніц, с.-г. работніц і батрачак.

Павялічэньне жаночай праслойкі ў складзе КП(б)Б магло быць дасягнута толькі таму, што партарганізацыі ў сваёй асноўнай масе па-бальшавіцку падыйшлі да рэалізацыі дырэктывы партыі аб вярбоўцы перадавой часткі работніц, батрачак і с.-г. работніц у рады партыі. Сярэдні процант работніц ад варштату у складзе жанчын, прынятых у КП(б)Б за ўсе 4 кварталы 1929 году, складае звыш 80. Гэтыя лічбы з усёй выразнасьцю сьведчаць аб тым зруху, які ёсьць у рабочых масах. Лепшыя работніцы, батрачкі і с.-г. работніцы ідуць у партыю Леніна.

Рэзэрвы

Партыйныя арганізацыі ні ў якім разе не павінны супакойвацца на тым, што ў КП(б)Б ёсьць некаторае паняліваньне жаночай праслойкі. Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што мы яшчэ далёка не скарысталі тых магчымасьцяй, якія ёсьць для павялічэньня радоў КП(б)Б за лік перадавых работніц ад варштату, батрачак і с.-г. работніц. На радзе заводаў і фабрык Беларусі партыйная праслойка сярод жанчын-работніц яшчэ зусім нездавальняючая. На шпейнай фабрыцы «Прафінтэрн» працуе звыш 460 работніц, а камуністак на фабрыцы налічваецца ўсяго 60 чал. Сярод 1.358 работніц, якія працуюць на фабрыцы «Дзьвіна», ёсьць толькі 76 камуністак. Партыйная праслойка сярод работніц фабрыкі імя Карла Маркса складае толькі 7 проц. Ясна, што далёка ня ўсе партыйныя арганізацыі выконваюць пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), які завастрыў увагу партарганізацый на патрэбнасьці «дабіцца асабліва значнага зруху ў справе вярбоўкі ў рады партыі работніц ад варштату».

Рэзэрвы для вярбоўкі работніц ад варштату вялізарныя. Партыйныя арганізацыі павінны поўнасьцю іх скарыстаць, штодзенна вярбуючы ў рады КП(б)Б перадавых работніц — ударніц сацыялістычнага спаборніцтва.

Побач з гэтым мы павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на павялічэньне камуністычнай праслойкі ў радох делегацкіх сходаў. Паводле далёка ня поўных вестак, у гарадох і фабрычна-заводзкіх паселках налічваецца звыш 130 делегацкіх сходаў, якія ахапляюць каля 6.000 делегатак. Партыйная праслойка сярод гэтае масы делегатак складае 0,5 проц. На вёсцы лік делегацкіх сходаў дасягае 1.000. Вясковыя делегацкія сходы ахапляюць звыш 30.000 делегатак. Партыйная-ж праслойка сярод іх складае ўсяго 0,8 проц.

Задачы

Міжнародны Жаночы Камуністычны Дзень павінен быць адзначан максымальным узмацненьнем вярбоўкі ў рады КП(б)Б перадавых кадраў работніц ад варштату, батрачак, с.-г. работніц і лепшых бяднячак - калгасьніц. Мы павінны папоўніць бальшавіцкія рады новымі кадрамі перадавых пралетарак. Кожная партыйная ячэйка на фабрыцы, у калгасе, саўгасе павінна добра ўсьвядоміць, што бяз шырокага ўцягненьня мас працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, мы ня здолеем выканаць задач, пастаўленых перад намі. І таму мы павінны пасьлядоўна вербаваць у рады пралетарскага авангарду новыя калёны лепшых работніц ад варштату, с.-г. работніц і батрачак, выхаваць апошніх у духу ленінізму, у духу непрымірымай барацьбы з усялякімі ўхілямі ад генэральнай лініі партыі і зраламі ад генэральнай лініі партыі і зраламі ад генэральнай лініі партыі і арганізатарамі мас працоўных жанчын. Толькі пры гэтай умове мы здолеем выканаць задачы, якія стаяць перад намі па мабілізацыі мас працоўных жанчын на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, на барацьбу за суцэльную калектывізацыю сельскае гаспадаркі, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе масавага калгаснага руху.

А. ПІПКІН.

Група работніц вагонных майстэрань уступіла ў партыю.

У вялікі гістарычны паход за пралетарскую культуру

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод працоўных жанчын

Савецкая ўлада атрымала ў спадчыну ад мінулага панаваньня капіталістых (памешчыкаў) вялікую культурную адсталасьць, амаль што пагалоўную няпісьменнасьць працоўных.

Асабліва няпісьменнасьць панавала сярод жанчын-сялянак. **На кожную 1.000 чал. прыпадала пісьменных толькі 70.**

На сёнешні дзень сьвяткаваньня Міжнароднага Жаночага Камуністычнага Дня пара вялікі жаль, мы яшчэ маем гэту спадчыну мінулага, вялікую няпісьменнасьць сярод жанчын, якая складае ва ўзросьце ад 12 да 45 год каля 65 проц. ўсіх няпісьменных.

Асноўныя кадры няпісьменных складаюць працоўныя жанчыны, якіх у тры разы больш, чым мужчын. Такім чынам, само пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці ў значнай ступені зьяўляецца спэцыфічна жаночым пытаньнем.

Няпісьменнасьць сялянкі-бяднячкі і батрачкі тармозіць тэмп сацыяльнай калектывізацыі вёскі і прытупляе клясавую барацьбу, перашкаджае арганізаваць сваю працу ў калгасах, будаваць новы быт.

У дзень 8-га сакавіка трэба праверыць тэмпы нашай работы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жанчын зьнізу да верху.

Папярэднія гады ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жанчын даюць наступны малюнак: у 1926-27 годзе ўсяго скончылі лікпункты 39.031 чал., з іх мужчыны 52,5 проц., жанчын—47,5 проц.; у 1927-28 годзе—39.339 чал., з іх мужчын 47 проц., жанчын—53 проц.; 1928-29 г. —67.750 чал., з іх мужчын—41,3 проц., жанчын—58,7 проц. У 1929-30 г. усяго навучаецца 230.000 чал., з іх жанчын каля 65 проц.

Гэтыя паказальнікі сьведчаць аб тым, што пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жанчын займае ўсё большае месца ў рабоце партыйных, савецкіх і іншых грамадзкіх арганізацый і што кожны год павялічваецца як агульны ахоп жанчын, так і процантныя адносіны да ўсіх скончыўшых лікпункты.

Аднак, гэтыя посьпехі і тэмпы растуць у параўнаньні з сучаснымі рэвалюцыйнымі тэмпамі і новымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца **зусім нязначнымі.**

Усё гэта высоўвае справу ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жанчын, як адну з важнейшых ударных палітычных задач.

Трэба зрабіць праверку выкананьня дырэктыў партыі аб поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці ў гэтым 1929-30 годзе сярод работніц, батрачак, актывістак, дэлегатак.

Сіламі жанчын-актывістак, дэлегатак, з прыцягненьнем грамадзкіх арганізацый, трэба правесьці масавыя агляды, праверку становішча работы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жанчын.

Правесьці 8-га сакавіка далейшую масавую вярбоўку няпісьменных і малапісьменных жанчын работніц, батрачак, бяднячак, калгасьніц у школы і лікпункты.

Адкрыць новыя лікпункты з жаночым складам. Дастасаваць працу школ да веснавых і летніх умоў быту і працы жанчын.

Трэба арганізаваць бытавую дапамогу жанчынам, якія навучаюцца, праз адкрыцьцё дзіцячых накояў, ясьляй, дзіцячых садоў, дашкольных хат.

Трэба аддаваць перавагу практыцы гараздзкога дэлегацкага сходу перад вясковым, калгасным, саўгасным дэлегацкім сходам, пісьменнай дэлегаткі над няпісьменнай і наогул кожнай пісьменнай жанчыны над няпісьменнай. Трэба вылучыць са складу лепшых жанчын арганізатараў лікпунктамі няпісьменнасьці.

У вялікі гістарычны паход за пралетарскую культуру, за пісьменнасьць.— Вось лёзунгі да 8-га сакавіка.

СЬЦЕПАНЮК.

Працоўная жанчына Заходняй Беларусі ў барацьбе супроць фашысцкай дыктатуры

(Паводле падпольнай прэсы КПЗБ)

У сувязі з міжнародным крызісам, які завастраецца, і сьпешнай падрыхтоўкай узброенага нападу на СССР, удзельная вага жанчын-работніц, жанчын-батрачак узрастае як у прамысловасьці, так і сельскай гаспадарцы, узрастае ня роля ў рэвалюцыйным руху. Гаспадарчы распад буржуазнай гаспадаркі капіталістыя і памешчыкі ходуць выратаваць шляхам жорсткай капіталістычнай рацыяналізацыі. Асабліва дзікая разгортваецца эксплёатацыя працы жанчын і падросткаў. У часе вайны ўдзельная вага працы жанчын у ваеннай прамысловасьці зойме нераўнаважнае месца, бо рабочыя будуць мабілізаваны ў армію. Кампартыя Зах. Беларусі ў разрэзе падзей, што адбываюцца, і выходзячы з ўздыму рэвалюцыйнага руху, вяла падрыхтоўку да 8-га сакавіка.

У органе ЦК КПЗБ «Бальшавік» зьмешчаны артыкул «Працоўная жанчына —застрэльшчык клясавых баёў», прысьвечаны 8 сакавіка.

«8-га сакавіка ўжо з 1910 г. зьяўляецца днём салідарнай барацьбы працоўных жанчын усяго сьвету, днём агляду іх баявой гатоўнасьці на барацьбу за сацыяльнае вызваленьне, за зваленьне пут сямі і кухні. 8 сакавіка працоўныя жанчыны разам з усім пралетарыятам усяго сьвету сваю штодзенную барацьбу супроць капіталістычнага ладу гартуюць у масавых рэвалюцыйных выступленьнях, робяць банную перакліч з працоўнымі жанчынамі ўсяго сьвету, завастраюць клясавую барацьбу і такім чынам узводзяць яе на вышэйшы ўзровень, больш грозны і рашучы для міжнародных імпэрыялістаў і жандэрбраў».

ЦК КПЗБ, заклікаючы працоўных Зах. Беларусі супроць фашысцкага рэжыму, шырока кампагандуе загаяваныя працоўных жанчын у СССР, паказваючы, як

«адзіны шлях упорлівай, цяжкай, але пераможнай барацьбы — гэта шлях Кастрычніка, шлях, па якім жанчыны ў СССР дабіліся поўнага высьвяленьня і роўнаправя. Толькі ў адным краі на сьвеце, у першай пралетарскай дзяржаве—у СССР—працоўная жанчына сьвяткуе сваю перамогу, свабоду і дасягненьні».

Далей адзначаецца, што становішча працоўнай жанчыны ў СССР, яе дасягненьні і ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве з большай яскравасьцю падкрэсьлівае жудаснае, нявольніцкае, бесправоўнае галоднае жыцьцё-быцьцё працоўнай жанчыны ў фашысцкай Польшчы.

Корчачыся ў канвульсіях вострага эканамічнага і палітычнага крызісу, фашысцкая дыктатура выкідвае на вуліцу тысячы і тысячы беспрацоўных, сьцісканае вясковую беднату галоднай сьмерцю і напаўняе гарады, мястэчкі і вёскі арміямі беспрацоўных, галодных хвяр палітыкі фашысцкага ўраду, палітыкі экспляёатацыі і вайны.

«Цяжары гэтага дзікага разгулу капіталу, пачуванай эксплёатацыі, прыгнечаньняў, тэрору, беспрацоўя, голаду і дарагоўлі кладуцца з падвойнай сілай на плечы працоўнай жанчыны. Капіталісты, абшарнік, кулак ужо не задавольваюцца крайнім паніжэньнем заробку рабочага дня, яны шукаюць яшчэ больш танных рук, яшчэ больш падатлівых рабочых для эксплёатацыі, а менавіта—жанчын і моладзі. Кола капіталістычнай рацыяналізацыі ўкручае працоўную жанчыну ў рабскую катаржную працу, даводзячы яе да абамлеьня, да вычарпаньня сіл, а часта-густа да сьмерці. Жабрачая аплата, 12-16 гадзін нечасільнай працы, зьдзекі паняверы, ніякай аховы жаночай працы і мацярынства ня існуе ў практыцы—вось нарукі жыцьця работніцы».

У найбольш буйных прамысловых прадпрыемствах Зах. Беларусі, як тэкстыльныя фабрыкі Беластоку, табачныя і хэмічныя ў Горадні і Вішку, фанэрныя фабрыкі, фабрыка штучнага шоўку ў Віленшчыне і г. д., працуюць бадай выключна жанчыны пры жорсткай эксплёатацыі ў надзвычайна цяжкіх умовах працы.

«Яшчэ горшае палажэньне батрачкі. Знаходзячыся далей ад рабочага асяродзьдзя, ад масавай барацьбы рабочае клясы, ёй трудней дамагацца сваіх правоў, абаронць сваё становішча. Абшарнік, асаднік, кулак эксплёатуюць яе, як быдла. Трымаючы батрачку на сваім ласкавым хлебе, у любы момант яны бяскарна могуць выгнаць батрачку на голад і холад. Ня выходзіцца тут гаварыць аб ахове працы і дапамозе, як бесправоўнай».

Падпольная газэта «Чырвоны Сьцяг» зьмяшчае карэспандэнцыю з Пастаўшчыны пад загалоўкам «Нявольніцкае жыцьцё батрачкі», дзе між іншым кажа:

«Асабліва жудаснае і нявольніцка-прыгоннае становішча зьяўляецца батрачак-жанчын. На полі працуе ад зары да зары, а ляпер узіму, седзячы ў голадзе і холадзе, таксама мусіць працаваць не пакладаючы рук. Адработкі на панскай кухні, дагляд панскага быдла, сьвіней, праца пры сартыроўцы і адборы бульбы, насеньня і г. д. А за ўсю гэту катаржную працу батрачка-жанчына атрымлівае ўсяго 16-25 грош. у дзень».

Буржуазія і яе клерыкальныя сацыял-фашысцкія і нацыянал-фашысцкія агенты добра разумеюць усю важнасьць барацьбы за заваяваньне працоўных жанчын, асабліва цяпер, у перыяд непасрэднай падрыхтоўкі да імпэрыялістычнай вайны. Фашысцкія арганізацыі ўсімі мерамі стараюцца ўпрэгчы працоўную жанчыну ў воз фашысцкае дыктатуры. Фашызм і яго агенты хочуць уцягнуць працоўную жанчыну ў ваенныя і поўаеенныя арганізацыі, вядуць шырокую мілітарызацыю працоўных жанчын і ўжо цяпер замяняюць працу рабочых у ваеннай прамысловасьці працай жанчын. Напрыклад, у хэмічнай прамысловасьці працуюць у пераважнай большасьці работніцы. «Бальшавік» кажа:

«Прыбітую і клясава несьвядомую працоўную жанчыну фашызм, сацыял і нацыянал-фашызм ня толькі выкарыстоўваюць дзеля выхаду з крызіснага тупіка, каб крывавым мазалём работніцы ратаваць сваё панаваньне. Фашызм і яго агенты—ПНС, Бунд, Луцкевічы і г. д. Беларускія нацыянал-фашыстыя—імкнуцца зрабіць працоўную жанчыну сваёй зброяй у разьбіваньні рэвалюцыйнага руху, у падрыхтоўцы нападу на СССР».

«Чырвоны Сьцяг», прысьвечаны 8 сакавіка, зьмяшчае на сваіх старонках нарыс аб сельска-гаспадарчай камуне імя Фрунзэ, Менскай акругі, дзе ў жывой форме даецца апосаньне жыцьця камунаркі і дасягненьні гэтай камуны.

КПЗБ заклікае працоўных жанчын Зах. Беларусі ў дзень 8 сакавіка выйсьці пад чырвонымі сьцягамі зьядналымі баявымі радамі на вуліцы пад рэвалюцыйнымі лёзунгамі супроць фашысцкай дыктатуры, за яе рэвалюцыйнае зьнішчэньне, супроць сацыял-фашыстых і нацыянал-фашыстых, за саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, за аб'яднаную Савецкую Беларусь. Барацьба 8 сакавіка павінна паслужыць імпульсам для разгортваньня рэвалюцыйнай барацьбы ў Зах. Беларусі ў больш масавым, баявым парадку. Цяпер, калі ў фашысцкай Польшчы, над кіраўніцтвам кампартыі, пралетарыяту, а за ім працоўнае сялянства разгортваюць наступленьне на фашысцкую дыктатуру, калі шпарка надыходзіць рашаючыя клясавыя баі, «працоўныя жанчыны, як атрад рэвалюцыйнага лягеру, найбольш прыгнечаны фашызмам, павінны ісьці ў першых радох барацьбітоў». КПЗБ, паказваючы працоўным масам на ўзрастаючую небясьпеку вайны супроць СССР, а асабліва сілай падкрэсьлівае неабходнасьць у масавых выступленьнях 8 сакавіка выявіць рашучасьць барацьбы супроць падрыхтоўкі гэтай вайны, выявіць гатоўнасьць стаць у абарону СССР, ператварыць імпэрыялістычную контр-рэвалюцыйную вайну ў вайну грамадзянскую супроць абшарнікаў, капіталістых, кулакоў і іх фашысцкай дыктатуры.

А. СТАЛЕВІЧ.

На ліквідацыю прарываў, за поўнае выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва

Да ўсіх работніц Савецкай Беларусі

Таварышы, першы год пяцігодкі, які даў перавышэньне намечаных плянаў сацыялістычнае рэканструкцыі нашае гаспадаркі, паказаў, што **Савецкая Беларусь, як частка вялікага Савецкага Саюзу, шпаркімі крокамі ідзе да ажыцьцяўленьня сацыялізму, да пабудовы новага сацыялістычнага грамадзтва.**

Працоўны ўздым, энтузіязм мас рабстніц і рабочых, які выявіўся праз сацыялістычнае спаборніцтва, ударныя брыгады і ударныя камуны, даў магчымасьць выканаць і перавыканаць намячэньні сацыялістычнага будаўніцтва і вызначыць пашыраную праграму будаўніцтва прамысловасьці, больш шпаркі тэмп калектывізацыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Ва ўсёй рабоце па сацыялістычным будаўніцтве прымалі і прымаюць актыўны ўдзел **работніцы, батрачкі, бяднячкі і серадняччкі - калгасьніцы.**

Але побач з посьпехамі першая квадра бягучага гаспадарчага году выявіла рад прарываў: недавыкананьне вызначаных тэмпаў у працы, невыстарчальнае зьніжэньне сабекошту, невыстарчальнае паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі рашуча ўзялася за ліквідацыю гэтых прарываў, за поўнае выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Растуць рады ленінскіх ударнікаў і ўдарніц, выкоўваецца жаданьне і ўпартае імкненьне рабочай масы выканаць пастаўленыя партыяй і савецкай уладай задачы.

Наш рост, які дае нам усё большую незалежнасьць ад капіталістычнага сьвету, выклікае шалёную злосьць сусьветнай буржуазіі; магнаты касьцёлаў, царквоў, сынагог, банкіры, здрадніцкія пісакі буржуазіі, — уся гэта зграя льле мора хлусьні і паклёпаў на Савецкі Саюз, вядзе бязупынную падрыхтоўку да ваеннага паходу на Савецкі Саюз.

Шалёнай агітацыяй супроць саветаў буржуазія хоча адцягнуць увагу рабочых ад узмоцненага наступленьня на цяперашнюю і без таго жабрацкую зарплату рабочых, падаўжэньня рабочага дня, зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню рабочых мас.

Міжнародны Рабочы Камуністычны Дзень 8 сакавіка будзе праходзіць па ўсім сьвеце, як **дзень барацьбы супроць наступленьня капіталізму на рабочую клясу, як дзень арганізацыі жаноча-пралетарскіх мас на апошні рашучы бой працы з капіталам,** як дзень мабілізацыі работніц усяго сьвету на абарону бацькаўшчыны ўсіх працоўных—СССР.

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі шчыра вітае ўсіх работніц, калгасьніц, усіх працоўных жанчын з 20-годзьдзем Міжнароднага Жаночага Дня і заклікае ўсіх работніц БССР правядзеньне гэтага дня скарыстаць для далейшай барацьбы:

За стварэньне новых ударных брыгад, за ўдарную работу, за ліквідацыю прарываў, за поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

За хутчэйшы тэмп **кваліфікацыі жаночае працы** і вылучэньне жанчын на кваліфікаваную работу на фабрыках і заводах, за вылучэньне работніц і калгасьніц на кіруючую работу ў дзяржаўных, гаспадарчых, прафсаюзных і кааперацыйных органах.

За ўзмацненьне **інтэрнацыянальнай сувязі паміж работніцамі і працоўнымі сялянкамі СССР,** працоўнымі жанчынамі **Заходняе Беларусі,** капіталістычных краін і прыгнечаных працоўных жанчынамі калёніяльных і поўкалёніяльных краёў.

За далейшы культурны ўзрост работніцы і працоўнае жанчыны, за ліквідацыю няпісьменнасьці, за большае павялічэньне ліку жанчын у школах, рабфаках і вышэйшых навучальных установах.

За рашучую перабудову быту, арганізацыю дамоў - камун, за далейшае разгортваньне будаўніцтва сацыяльна-бытавых устаноў, сталовак, ясьляй, дзіцячых садоў, пляцовак, пральняў, за стварэньне ўмоў для ўцягненьня работніцы і працоўнае жанчыны ў актыўную грамадзкую работу ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

За ўстанаўленьне моцнае сувязі паміж работніцамі і бядняцка-батрацкімі масамі сялянак, за дапамогу апошнім у пабудове новага жыцьця і быту ў калгасах.

За актыўны ўдзел жанчын у рабоце **па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны,** за вазнаёмленьне, за дапамогу і сувязь з Чырвонай арміяй і з арганізацыямі Асоавіяхіму.

За яшчэ большы моцнае аб'яднаньне работніцы, батрачкі і працоўнай калгасьніцы **вакол ленінскай камуністычнай партыі.**

За масавае ўступленьне перадавых работніц, батрачак і лепшых калгасьніц у рады камуністычнае партыі.

Няхай жыве Міжнародны Жаночы Камуністычны дзень — 8 сакавіка!

Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

ЦСПСБ.

Канец дакладу тав. ГАПАДЗЕДА на ўсебеларускай канфэрэнцыі батрацка-бяднацкіх груп будзе надрукаваны ў заўтрашнім нумары.

Насустрач жанчыне-работніцы

У сувязі з сьвяткаваньнем дня 8-га сакавіка на прадпрыемствах і ўстановах **адкрываецца рад новых дзіцячых ясьляй.** Рабочыя фабрыкі «Кастрычнік» настанавілі адкрыць дзіцячыя ясьлі на 60 чалавек. Для ясьляй будзе пабудаваны спэцыяльны дом.

ЖАКТ № 16 адкрывае ясьлі на 30 дзяцей. Да гэтага часу ні адзін з ЖАКТаў ня меў яшчэ дзіцячых ясьляй.

Сёньня адбудзецца агульны сход рабочых заводу «Бальшавік», на якім таксама будзе стаяць пытаньне аб адкрыцьці ясьляй.

Адкрыты ясьлі на 40 чалавек у полескім калгасе «Камінтэрн», Сьмілавіцкага раёну.

Гэтымі днямі распачалі працу курсы для калгасьніц-актывістак у Сьмілавіцкім і Капыльскім раёнах. Мэта курсы —падрыхтаваць працаўнікоў для ясьляй. Усяго на курсы прынята звыш 100 чалавек.

* *

Агульны сход працаўнікоў установы «Аховы мацеры і дзіцяці» узяў ініцыятыву перад Дзяржпрыцам і ВЦВК аб арганізацыі **у Менску Інстытуту аховы мацеры і дзіцяці.** Будзе рыхтаваць работнікаў для дзіцячых устаноў.

Адзел «Аховы мацеры і дзіцяці» сумесна з секцыяй аховы ладароў пры савеце арганізаваў **20 брыгад для абсьледаваньня дзіцячых устаноў.**

* *

Эканомнарада даручыла Наркамдаю заготовіць ў вясновапетні час 16.000 тон бульбы для гараду БССР; Белрадсекцыі даручана максымальна ўзмацніць забесьпячэньне гараду гародніной за лік арганізацыі гародных гаспадарак, кантрактацыі і заготовак у калгасах і саўгасах.

А. ЧАРВЯКОЎ

За суцэльную калектывізацыю і за ліквідацыю кулацтва, як клясы

Весткі на 20-е лютага г. г. паказваюць, што ў БССР ужо калектывізавана звыш 56 проц. агульнага ліку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, што ахапляе 65 проц. усёй пахаці. Па асобных акругах і раёнах гэтыя лічбы значна навышаюцца. Так, па Мазырскай акрузе калектывізавана звыш 80 проц. гаспадарак і ахоплена 90 проц. пахаці; па Магілёўскай акрузе—79% гаспадарак і 82 проц. пахаці; у Сьмілавіцкім раёне, дзе я працаваў у вёсках на працягу 2-х апошніх тыдняў, калектывізавана па гэты-ж тэрмін 73 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак і ахоплена 93 проц. пасэўнай плошчы.

Гэтыя лічбы вельмі выразна паказваюць надзвычайна буйныя посьпехі калектывізацыі ў Беларусі. Дасягнутыя посьпехі калектывізацыі зьяўляюцца, як гэта зусім правільна адзначыў студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б, «непасрэдным вынікам правільнай палітыкі партыі па вёсцы, вынікам узмацненьня кіруючай ролі рабочае клясы ў адносінах да бядняцка - серадняцкага сялянства, вынікам магутнага росту сацыялістычнай індустрыі і ўзмацненьня вытворчых форм сувязі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства».

Гэтыя посьпехі яшчэ і яшчэ раз пацьвярджаюць правільнасьць усёй палітыкі партыі і канчаткова паказваюць поўнае палітычнае банкрутства правых ухілістых.

З усяго гэтага відаць, што меркаваньні студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб поўнай калектывізацыі ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР да канца 1931 году ня толькі ня былі перапавялічанымі, але, як паказвае практыка працы, змогуць быць значна скарочаны, бо суцэльная калектывізацыя, ідучы такімі тэмпамі, будзе скончана ў значна кароцейшы тэрмін.

У вёсцы ў сучасны момант адбываюцца надзвычайна глыбокія працэсы, зьвязаныя з перабудовай паасобных індывідуальных сялянскіх гаспадарак на калектыўных падставах. Гэта перабудова ахапляе ўсё бакі сялянскага жыцьця. У той час, як серадняцкая маса, сьледам за беднатой і батрацтвам, стала рашуча на шлях калектывізацыі сваёй гаспадаркі, кулацтва рашуча і яшчэ больш жорстка выступае на барацьбу супроць калектывізацыі і супроць савецкай улады.

Цьвёрдасьць партыйнага кіраўніцтва, клясавая выразнасьць працы савецкіх органаў пры правядзеньні калектывізацыі павінны быць накіраваны на тое, каб згуртаваць батрацка - бядняцкія элементы вёскі і ўзмацніць іх сувязь з серадняком, забясьпечыўшы кіруючую ролю бедноты ў бядняцка - серадняцкім блёку.

Дзякуючы гэтаму кіраўніцтву, ужо ў сучасны момант мы маем вылучэньне энтузіястых калектыўнай справы; растуць шырокія пласты актыву калгасьнікаў, што высоўваюць батрацка - бядняцкія і серадняцкія масы сялянства.

Разам з гэтым цьвёрдасьць партыйнага кіраўніцтва і клясавая выразнасьць у справе калектывізацыі палягчаюць выяўленьне вылазак нашых клясавых ворагаў і арганізацыю рашучай барацьбы супроць усіх праяўленьняў контррэвалюцыйнай дзейнасьці кулакоў і іншых контр-рэвалюцыйных элемэнтаў.

Посьпехі калектывізацыі, усё большае павялічэньне ўдзельнай вагі таварнай прадукцыі абагуленага сэктару сельскай гаспадаркі ўтварылі матар'яльную падставу для пераходу ад палітыкі абмежаваньня кулацтва, да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Такім чынам, мы ў выніку суцэльнай калектывізацыі прыступілі да ліквідацыі кулацтва. Патрэбнасьць гэта павінна быць яснай для ўсіх працоўных. Тым больш гэта важна, што разгортваньне калектывізацыі сельскае гаспадаркі і рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы выклікалі самую жорсткую барацьбу супроць калектывізацыі ня толькі з боку кулацтва, але і з боку ўсіх варожых Савецкай уладзе контр-рэвалюцыйных элемэнтаў гораду і вёскі.

Гэта яшчэ раз выразна даводзіць неабходнасьць рашучага і хуткага зьнішчэньня кулацтва, як клясы, у выніку суцэльнай калектывізацыі і на падставе згуртаваньня батрацка - бядняцкіх і серадняцкіх мас сялянства. Ўсякая нерашучасьць у гэтым пытаньні толькі пашкодзіць і будзе затрымліваць узмацненьне створаных і пабудову новых калгасаў. Мне прышлося наглядаць непасрэдна, як праводзіцца гэта праца ў вёсцы, і я павінен адзначыць, што батрацка - бядняцкія, а разам з імі серадняцкія масы вёскі самі патрабуюць хутчэйшага правядзеньня ў жыцьцё гэтага мерапрыемства і самі прымаюць актыўны ўдзел у гэтай справе. Праводзячы ліквідацыю кулацтва, яны ставяць таксама рашуча пытаньне аб ачыстцы раёнаў суцэльнай калектывізацыі ад усіх варожых саветам і партыі контр-рэвалюцыйных элемэнтаў.

Зьнішчаючы кулацтва, як клясу, мы павінны адразу-ж прыняць крокі да таго, каб несьці рашучую барацьбу супроць кулацкіх настрояў і тэндэнцый унутры сваёй калгасаў і супроць тых апартуністычных элемэнтаў унутры нашай партыі, што падтрымоўваюць гэтым кулацкім тэндэнцыям і настроям. Калі, з аднаго боку, вынікам узмацненьня кіруючай ролі пралетарыяту на бядняцка - серадняцкія масы сялянства мы маем масавы рух апошніх у калгасы, то з другога боку, як са спадчынай прыватна-ўласьніцкіх навыкаў, мы ніўхільна сустракаемся з прыватна-ўласьніцкімі — кулацкімі настроямі і тэндэнцыямі ўнутры саміх калгасаў. Практыка першых крокаў у калгасах паказвае на наяўнасьць такіх тэндэнцый. Разбазараньне насеньня, жывёлы і наогул маемасьці з боку паасобных груп сялянства, што ўступае ў калгасы, ёсьць яскравы прыклад такіх кулацкіх тэндэнцый, вывучэньне якіх прыводзіць нас да непасрэднай крыніцы гэтых тэндэнцый — кулака.

Да праяў гэтых тэндэнцый трэба адносіць паасобныя

ПЯЦІГОДКУ—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ!

Работніцы, уступайце ва ўдарныя брыгады

Пакажэце прыклад камуністычных адносін да працы

Да новых перамог!

На Менскай шчацінная фабрыцы—600 работніц. Таму па фабрыцы асаблівы рыхтуюцца да сьвята 8-га сакавіка. Усе жанчыны прымаюць удзел у сацспаборніцтве і зьяўляюцца ўдарніцам. Прадукцыйнасьць працы за апошнюю дзесяцідзёўку **павысілася на 14,8 проц.**

76 работніц падалі заяву ў фабком аб добраахвотным павялічэньні норм выпрацоўкі. 16 работніц за апошнія дні падалі заявы **аб жаданьні ўступіць у Ленінскую партыю.**

Работніцы не забываюць і пра свае абавязкі ў адносінах да вёскі. Для правядзеньня сьвята 8-га сакавіка работніцы пасылаюць туды брыгаду і струнны аркэстр. З вёскі запрошаны для ўдзелу ў сьвяткаваньні на фабрыцы 7 сялянак.

Трэба адзначыць, што работніцы шчацінная фабрыкі кіруюць і на кепска кіруюць жыцьцём свае фабрыкі, якая зьяўляецца патрэбнаю шрубкаю ў вялікай сацыялістычнай савецкай дзяржаве.

Н. ГАФТ.

Роўнапраўная будаўніца сацыялізму

На абуткавай фабрыцы больш ня чутно крытыкі з работніц. Работніцы значна вырасьлі. На фабрыцы на сёньні ня ведаюць налічваецца 155 работніц, з іх 62 беларускі, 78 яўрэек, 9 рускіх, 5 полек і 1 татарка. Ва ўдарных брыгадах знаходзіцца 36 камсамолак, 28 членаў партыі і ўсе беспартыйныя работніцы.

Гэты рост і актыўны ўдзел жанчын у грамадскім жыцьці прымусілі папых рабочых глядзець на жанчыну не з насьмешкаю, **а як на роўнапраўную будаўніцу сацыялізму.**

Ва ўсіх цэхах работніцы працуюць таксама пры машынах. **8-га сакавіка калектыў выпускае яшчэ 21 жанчыну на вышэйшую кваліфікаваную работу.** 8 работніц атрымліваюць павышэньне ў разрадах.

У гэты-ж дзень 5 лепшых работніц **—Каплан Сіма, Шнітман, Войткун, Маркус і Шуспак**—атрымаюць прэмі.

ФІШКІН.

Яшчэ 52 ударніцы

На швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» працуе каля 680 работніц, з іх ва ўдарных брыгадах лічыцца **536 чал.** Зараз арганізуецца яшчэ адна ўдарная брыгада **з 52 работніц.**

35 работніц падалі калектыўную заяву аб жаданьні ўступіць у партыю. У дзень 8-га сакавіка лепшыя ўдарніцы будуць прэміяваны.

Н. ШУСТЭР.

У вытворчую камісію заводу „Чырвоная Зара"

Заява

У дзень 8-га сакавіка добраахвотна павялічваю норму выпрацоўкі на 10 проц. і выклікаю на тое-ж самае наступных таварышоў-упакоўшчыц: Міндэль, Гувіч Х., Тайц, Чэрчэс Р. і Гардон.

Работніца АБАЛІКШТА ГЭЛЯ.

ЗАЎВАГА: Тав. Абалікшта, калі ўступіла ва ўдарную брыгаду, таксама павялічыла норму выпрацоўкі на 10 проц.

Змагаемся за прамфінплян

На цукеркавай фабрыцы «Камунарка» працуе 150 жанчын. З іх арганізаваны ва ўдарныя брыгады **130.** Толькі малодшы абслугоўваючы персанал — на - за ўдарнымі брыгадамі.

Брыгады ўдарніц на справе даводзяць сваю адданасьць будаўніцтву сацыялізму. **Брыгада глязіроўшчыц добра ахвотна павысіла нормы выпрацоўкі на 20 проц., брыгада па упакоўцы шакаладу—на 50 проц., брыгада па ўкладцы цукерак і распрацоўцы шакаладу таксама на 20 проц.**

У дзень 8-га сакавіка лепшыя ўдарнікі—**Шапіра Д., Асіпчук, Фэйгельман, Барсук, Сіндлер і Падаставец**—будуць прэміяваны.

За апошні час 5 работніц уступілі ў рады партыі. Да 8-га сакавіка яшчэ 7 работніц падалі заявы ў партыю.

РАБОТНІЦА.

Работніцы фармзаводу абяцаюць...

На фармзаводзе зараз працуюць 60 жанчын. Амаль усе работніцы прымаюць актыўны ўдзел у сацспаборніцтве і зьяўляюцца ўдарніцамі. Есьць пімат выпадкаў, калі работніцы добраахвотна зьніжаюць свае расцэнкі. Усе актыўна вядуць грамадзкую работу. 16 работніц зьяўляюцца дэлегаткамі. 6 работніц у апошні час уступілі ў рады Ленінскае партыі.

У дзень 8-га сакавіка работніцы фарм заводу абяцаюць яшчэ шчыльней згуртавацца вакол Ленінскай партыі і **выканаць пяцігодку ў чатыры гады.**

Работніца САСНОВА.

Упарта змагацца за прамфінплян

На галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» працуюць 250 работніц, якія ўсе ўцягнуты ва ўдарныя брыгады і вытворчыя камуны. Лепшая з ударных брыгад працуе ў палатняна - гузікавым цэху і паказвае добры прыклад іншым ударным брыгадам. Норма выпрацоўкі ў іх 17 грос, а яны выробліваць **па 18-20 грос.**

Старыя работніцы **Рагачова, Замеўская, Каравава і Вішнеўская** першыя на фабрыцы арганізавалі **вытворчую камуну** і абавязаліся ліквідаваць поўнасьцю брак, прагулы і г. д., пры чым, **павысілі норму выпрацоўкі на 2 гросы.** Зарплату яны атрымліваюць **па аднэй кніжцы.** Іх прыкладу пасьледвалі работніцы і мыечная цэху.

У дзень 8-га сакавіка лепшыя работніцы будуць прэміяваны.

М. ЦЫРЛІН.

У рады ўдарнікаў

6-га сакавіка на агульным сходзе **работніц заводу «Дрэваапрацоўшчык»** 7 работніц—**Камінская А., Сачыўка М., Сьпявак А., Яловіцэр Р., Рэйнгальд Ф., Крывіцкая А. і Зубкова**—падалі заяву аб жаданьні ўступіць ва ўдарныя брыгады.

Работніцы заяўляюць, што, уступаючы ў рады ўдарнікаў, яны будуць усімі сіламі дамагацца выканаўньня прамфінпляну і будуць змагацца з усімі зьявішчамі, якія перашкаджаюць будаваць сацыялізм.

Работніца Ю. Яхновіч.

Усе ўдарніцы

У мінулым годзе **на заводзе «Камунар»** былі ўсяго толькі 3 работніцы. Зараз на заводзе налічваецца 35 работніц, з іх 30 працуюць на кваліфікаванай вытворчай работе. Работніцы прымаюць актыўны ўдзел у сацспаборніцтве і зьяўляюцца ўсе ўдарніцамі. Актыўна прымаюць удзел у работе вытворчых парад. Усьведамляючы важнасьць хутчэйшага згортаньня індустрыялізацыі, работніцы добраахвотна зьніжаюць расцэнкі і акуратна выконваюць узятыя на сябе абавязкі па сацспаборніцтве.

Сёньня работніцы працуюць замест 6 гадзін усе 8 і заработак за дзьве гадзіны **аддаюць у фонд індустрыялізацыі.**

Ю. Д.

Работу дэлегацкіх сходаў—на баявыя тэмпы

У апошні час сярод некаторых таварышоў зьявіліся настроі, быццам-бы асобнае работы сярод работніц весьці ня трэба, бо яны досыць абслугоўваюць ячэйкамі і прафсаюзнымі арганізацыямі.

Гэтыя таварышы зусім ня ўлічваюць таго, што на прадпрыемствах БССР, дзе да апошняга часу была зусім незначная праслойка работніц, зараз уліваюцца значныя кадры новых работніц, якія ніколі не працавалі на прадпрыемствах і прынесьлі з мястэчак і вёсак адсталыя настроі. Вось чаму роля дэлегацкіх сходаў у справе клясавага выхаваньня гэтых кадраў работніц ня толькі не памяншаецца, а наадварот, яшчэ павялічваецца.

У некаторых мясцох партыйныя вясковыя ячэйкі тлумачаць слабую работу дэлегацкіх сходаў перагружанасьцю. «Вось скончым базную кампанію, тады і работу з дэлегаткамі падцягнем»

Гэта — поўнае непаразуменьне задач і ролі дэлегацкіх сходаў. Іменна якраз у гэты час патрэбна асабліва ўзмоцненая работа дэлегацкіх сходаў, бо, мабілізаваўшы актыўнасьць дэлегатак для выкананьня чарговых задач, мы з посьпехам справімся з усімі кампаніямі, якія мы праводзім на вёсцы і ў горадзе. Такія разважаньні сьведчаць аб тым, што некаторыя таварышы ўсё яшчэ глядзяць на дэлегацкія сходы, як на «школу палітграматы», і не мабілізуюць актыўнасьці дэлегатак на баявых, практычных задачах сёньняшняга дня.

Мы мелі ў мінулым годзе 5 тысяч дэлегацкіх сходаў, якімі ахоплена было звыш 30 тыс. работніц, батрачак, бядняцтак і серадняцтак. Сёлета лік дэлегатак асабліва за кошт калгасьніц значна павялічыўся. А колькі працушчана праз дэлегацкія сходы работніц у мінулыя гады? Гэта цэлая армія.

Якія зараз практычна стаяць перад намі задачы ў парткіраўніцтве дэлегацкімі сходамі?

У горадзе асноўным рашаючым момантам зьяўляецца **мабілізацыя актыўнасьці дэлегатак у сацыялістычным спаборніцтве.** Трэба дабіцца, каб кожная дэлегатка - работніца ўявіла сябе, **што дэлегатка ня можа быць ня ўдарніцай,** што дэлегатка павінна быць **у першых радох ударніцкага руху,** начальнікам у сацыялістычным спаборніцтве, у выкананьні прамфінпляну, у барацьбе супроць растрат на вытворчасьці.

Асноўная ўвага ў рабоце дэлегацкіх сходаў на вёсцы павінна быць зьвернута на **прыцягненьне праз дэлегацкія сходы батрачак, бяднячак і сераднячак да суцэльнай калектывізацыі, да ліквідацыі кулацтва, як клясы, да гаспадарчага ўзмацненьня ўжо арганізаваных калгасаў.**

У рабоце дэлегацкіх сходаў павінна выразна праводзіцца клясавая лінія. Трэба дабіцца таго, каб дэлегаткі-батрачкі і бяднячкі—былі ўцягнуты ў працу сходаў і груп беднаты і праз дэлегацкія сходы ажыцьцяўлялі-б пастановы груп беднаты сярод мас працоўных жанчын. А для гэтага трэба забясьпечыць сацыяльны склад дэлегатак. Бо мы маем рад выпадкаў, калі пад маскай актывісткі ў дэлегацкія сходы пралазіць кулачка. Трэба сярод дэлегатак скласьці грамадзкую думку, што шкоднікам калектывізацыі ня месца сярод дэлегатак.

Усе гэтыя задачы патрабуюць ад нас рэарганізацыі работы дэлегацкіх сходаў. Мы павінны дабіцца таго, каб праца дэлегацкіх сходаў разгортвалася ў нагу з тэмпам нашага жыцьця. Дэлегацкія сходы павінны працаваць па-баявому, па-новаму

А. Р.

Аб двух лёзунгах

У жорсткай і абостранай клясавай барацьбе адбываецца будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, разьвіваецца рашучае наступленьне пралетарыяту. Крок за крокам рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, атрымліваючы перамогу за перамогай над клясавымі ворагамі, наперакор праваўхілісцкім крароцтвам і дробна-буржуазнаму панікёрству рушыцца жалезным поступам наперад. У барацьбе з ухіламі, у барацьбе з правым апартунізмам, галоўнай небясьпекай цяперашняга перыяду, у барацьбе а «левым» апартунізмам ажыцьцяўляецца ленінская лінія партыі.

Мы ўступілі ў новы этап пераходнага ад капіталізму да сацыялізму перыяду. Наша партыя прарабіла паварот у сваёй палітыцы на вёсцы. Мы перайшлі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Ад старое палітыкі абмежаваньня і выцісканьня капіталістычнага элементу мы перайшлі да новай палітыкі, палітыкі зьнішчэньня кулацтва, як клясы. Мы маем у радох нашай партыі яшчэ нераўменьне існасьці гэтага павароту, мы маем праваапартуністычныя спробы «чапляцца» за старыя пастановы партыі, правільныя для мінулага перыяду, каб утаіць свае анапартуністычныя погляды і тэорыі. Тав. Сталін з вычарпальнай яснасьцю ў артыкуле «К вопросу о политике ликвидации кулачества, как класса», крытыкуючы неправільнае ня артыкулу тав. Ру[illegible], настаўляючы пытаньне аб павароце, [illegible]зленым у палітыцы партыі. Гаворачы б старой палітыцы абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элементаў, тав. Сталін паказваў: «Гэта палітыка ня пасаў нас на толькі ў перыяд адпаўленьня, але і ў перыяд рэканструкцыі, але і ў перыяд пасьля 15 зьезду (сьнежань 1927 г.), але і ў перыяд 16 канфэрэнцыі нашай партыі (красавік 1929 г.), як і пасьля гэтай канфэрэнцыі аж да лета 1929 г., калі ступіла ў нас паласа суцэльнай калектывізацыі, калі наступіў пералом у бок палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы».

Становішча карэнным чынам зьмянілася, калі на падставе шпаркага росту індустрыялізацыі краіны пачалі стварацца магчымасьці для вырашэньня задачы шырокай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Гэты рост сацыялістычнай індустрыі аказаў вялікі рэвалюцыянізуючы ўплыў на шырокія масы бядняцка - серадняцкага сялянства. Гэта «знайшло сваё адлюстраваньне ў бурным імкненьні асноўных бядняцка - серадняцкіх мас сялянства да калектыўных форм зямлякарыстаньня. Серадняк нашу ў калгасы». Чаму наша партыя не магла зрабіць паароту ў бок ліквідацыі кулацтва, як клясы, раней? Тав. Сталін вырвана адказаў на гэтае пытаньне на зьезьдзе аграрнікаў-марксыстых: «Таму, што ў нас ня было яшчэ тых апорных пунктаў на вёсцы, у выглядзе шырокай сеткі саўгасаў і калгасаў, на якіх можна было-б грунтавацца ў рашучым наступленьні супроць кулацтва. Таму, што мы ня мелі тады магчымасьці замяніць капіталістычную вытворчасьць кулака сацыялістычнай вытворчасьцю ў выглядзе саўгасаў і калгасаў». Цяпер-жа становішча карэнным чынам зьмянілася. «Цяпер, — паказваў тав. Сталін на канфэрэнцыі агр. - марксыстых, — у нас ёсьць, як бачыце, матар'яльная база для таго, каб замяніць кулацкую вытворчасьць вытворчасьцю калгасаў і саўгасаў. Вось чаму нашае наступленьне на кулацтва цяпер бязумоўны посьпех. Вось як трэба наступаць на кулацтва, калі гаварыць аб сапраўдным наступленьні, а не абмяжоўвацца пустапарожняй дэкламацыяй супроць кулацтва».

Палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, была падрыхтавана ўсёй нашай папярэдняй барацьбой і работай. Але-ж было-б вялікай памылкай думаць, што палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, «зьяўляецца простым працягам старое палітыкі абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элементаў». Было-б таксама буйной апартуністычнай памылкай сьцьвярджаць, што палітыка абмежаваньня кулацтва і ёсьць палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы. Ставіць пытаньне так, значыць, ня бачыць каранной розьніцы паміж палітыкай абмежаваньня і палітыкай ліквідацыі кулацтва, як клясы. Гаварыць так, значыць, ня бачыць, што палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, акарэнным чынам» адрозьніваецца ад старое палітыкі выцісканьня і абмежаваньня. «Каб выціснуць кулацтва, як клясу, дзеля гэтага недаводзі палітыкі выцісканьня і абмежаваньня паасобных яго атрадаў. Каб выціснуць кулацтва, як клясу, трэба зламаць у адкрытым баі супраціўленьне гэтай клясы і пазбавіць яе вытворчых крыніц існаваньня і разьвіцьця (вольнае карыстаньне зямлёй, сродкі вытворчасьці, арэнда, права найму працы і г. д.). Гэта і ёсьць паварот да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Бяз гэтага гаворка аб выцісканьні кулацтва, як клясы, ёсьць пустая балбатня, угодная і выгодная толькі правым ухілістым» (Сталін).

Трэба з усёй сілай біць па тых, хто не разумее і ня бачыць праробленага павароту, хто стварае гэтым «ідэалёгічнае прыкрыцьцё» для апартуністычных элементаў і сам скочваецца тым самым ны ўпартасьці па гэтых памылках у абоймы правага апартунізму.

Калектывізацыя зьяўляецца асноўным мэтадам ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы. Гэтаму асноўнаму мэтаду падпарадкаваны ўсе астатнія мэтады. Усе мэтады, якія супяніныя мэтады. Усе мэтады, якія супрэчаць гэтаму мэтаду, павінны быць адкінуты. Таму было-б буйнейшай памылкай процістаўіць справу калектывізацыі справе ліквідацыі кулацтва, як клясы. «Стварэньне раёнаў суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, а не паасобных груп кулацтва, — зьяўляюцца **бакамі аднаго і таго-ж працэсу.** І з гэтага пункту погляду не магло-б быць нічога больш памылковага, як процістаўіць справу калектывізацыі — раскулачваньню, ліквідацыі кулацтва, як клясы («Б—к» № 2).

Задача ліквідацыі кулацтва ня можа ставіцца «па-за сувязьзю з ростам калгаснага будаўніцтва, часткаю якога яна зьяўляецца». Павінна быць зусім ясным, што лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, зьяўляецца асноўным і генэральным лёзунгам партыі. Працэс суцэльнай калектывізацыі ахапляе усю краіну, усю савецкую вёску. Гэты працэс адбываецца няроўнамерна і неадначасова ва ўсёй краіне. Гэты працэс суцэльнай калектывізацыі не зьяўляецца якім-небудзь мясцовым, абасобленым працэсам. Таму з часу пераходу да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, гэты апошні лёзунг (ліквідацыя кулацтва, як клясы) зрабіўся **галоўным лёзунгам.** У раёнах суцэльнай калектывізацыі на падставе суцэльнай калектывізацыі беспадзельна дзейнічае лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы. «У тых раёнах і краінах, дзе калгаснае будаўніцтва набыло магутнае разьвіцьцё, дзе разгортваецца суцэльная калектывізацыя, дзе вытворчасьцю калгасаў і саўгасаў можа быць заменена вытворчасьць кулацкіх гаспадарак, — абмежаваньне і выцісканьне кулацкіх і капіталістычных элементаў было заменена палітыкай **простай ліквідацыі** кулацтва, як клясы». («Б—к»).

У раёнах нясуцэльнай калектывізацыі лёзунг абмежаваньня і выцісканьня ператварыўся «з самастойнага лёзунгу ў лёзунг **дапаможны,** у лёзунг **падсобны** ў адносінах галоўнага лёзунгу, у лёзунг, які палягчае ў гэтых апошніх раёнах падрыхтоўку для пераходу да галоўнага лёзунгу» (Сталін).

Лёзунг абмежаваньня і выцісканьня зьяўляецца зараз «урэзаным» лёзунгам. Гэты лёзунг зараз завастраецца супроць кулацтва ў большай ступені, чым гэта было ў пэрыяд, калі гэты лёзунг быў галоўным і асноўным. Сюды трэба аднесьці надзвычайныя меры пры загатоўках збожжа, прымусовую кантрактацыю засеваў кулацтва і надзвычай рашучыя папраўкі, якія ўнесены ў лёзунг абмежаваньня законам ЦВК аб мерах барацьбы з дралежніцкім забоем жывёлы. Гэты закон, зусім відавочна, распаўсюджваецца і на раёны нясуцэльнай калектывізацыі.

Было-б грубейшай памылкай лічыць, што лёзунг абмежаваньня і выцісканьня зьяўляецца роўным і самастойным лёзунгам. Нельга мэханічна падзяляць сфэру дзейнасьці гэтых лёзунгаў. Асноўным і важнейшым зьяўляецца тое, што мы прарабілі паварот у палітыцы партыі, паварот у бок палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Ва ўмовах новай палітыкі партыі на вёсцы нелажэньне лёзунгу абмежаваньня карэнным чынам зьмянілася. Гэты лёзунг зрабіўся лёзунгам дапаможным, падпарадкаваным лёзунгу галоўнага і генэральнага ў адносінах да галоўнага і генэральнага лёзунгу партыі. Гэты лёзунг спадучаецца ў сваёй дзейнасьці з галоўным лёзунгам і, палягчаючы ў раёнах нясуцэльнай калектывізацыі падрыхтоўку ўмоў для пераходу да галоўнага лёзунгу. «Такім чынам, дзе калгаснае будаўніцтва ня набыло, дзе калгаснае будаўніцтва ня набыло таго магутнага разьвіцьця, якое дазволіла-б замяніць вытворчасьць кулацкіх гаспадарак вытворчасьцю калгасаў і саўгасаў, — цэнтр цяжару павінен быць перанесены на разгортваньне калгаснага будаўніцтва, на меры росту якога будзе ў далейшым зьмяняцца палітыка і ў адносінах кулака: ад абмежаваньня і выцісканьня кулацка - капіталістычных элементаў, да іх поўнай ліквідацыі, як клясы». («Б—к» № 2).

У нашым артыкуле «За правільную пастаноўку пытаньня» («Зьвязда» № 40) мы крытыкавалі паасобныя памылковыя пазыцыі ў артыкулу тав. А. Горына («Чырвоная Зьмена» № 37), якія выяўляліся ў тым, што тав. Горын ня бачыў розьніцы паміж раёнамі суцэльнае калектывізацыі і раёнамі нясуцэльнай калектывізацыі, зьяўшы лёзунг абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элементаў, гэты дапаможны лёзунг у раёнах нясуцэльнай калектывізацыі. У гэтай сувязі ён разглядаў раскулачваньне, як «заключны акт» ліквідацыі кулацтва, як клясы. Зусім відавочна, што гэтыя палажэньні вялі, незалежна ад уласнай волі тав. Горына, да змазваньня сутнасьці павароту. Палажэньне, высунутае ім, аб раскулачваньні, як аб заключным акце ліквідацыі кулацтва, як клясы, вяло па сутнасьці да затушоўваньня пытаньня клясавай барацьбы.

Мы ў гэтым артыкуле, гаворачы аб суадносінах галоўнага і дапаможнага лёзунгу, пісалі так: «Паказваючы на паяўнасьць у сучасны пераходны пэрыяд у нас **двух лёзунгаў** (ліквідацыі кулацтва, як клясы, і абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элементаў), тав. Сталін заўважае, што гэтыя лёзунгі нельга ставіць, **як два самастойныя і роўнапраўныя лёзунгі.** Тав. Сталін падкрэсьлівае, што «ад часу пераходу да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, гэты апошні лёзунг стаў галоўным лёзунгам, а лёзунг абмежаваньня і выцісканьня ў раёнах дзе суцэльнай калектывізацыі ператварыўся з самастойнага лёзунгу ў лёзунг **падсобны,** у лёзунг дапаможны ў адносінах да галоўнага лёзунгу, у лёзунг, які палягчае ў гэтых апошніх раёнах падрыхтоўку ўмоў для пераходу да галоўнага лёзунгу».

Іменна многія не разумеюць, што лёзунг абмежаваньня і выцісканьня, наліпуты намі ў раёнах, дзе няма суцэльнай калектывізацыі, павінен служыць справе падрыхтоўкі гэтых раёнаў да пераходу да галоўнага лёзунгу, лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, да «экспрапрыяцыі экспрапрыятараў». Змагаючыся з усёй сілай супроць усялякіх перагібаў, **партыя будзе даваць рашучы адпор тым, хто не зразумее гэтага асноўнага, гэтага важнейшага ў пастаноўцы пытаньня аб двох лёзунгах.**

Гэтым самым мы ясна паказалі, што лёзунг выцісканьня і абмежаваньня зьяўляецца лёзунгам дапаможным і **няроўнапраўным** у раёнах ня суцэльнай калектывізацыі, які дапамае падрыхтоўцы ўмоў для пераходу да суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы. У сваім артыкуле мы падкрэсьлівалі, што партыя павінна змагацца з тымі, хто не разумее іменна такое пастаноўкі пытаньня суадносін гэтых лёзунгаў.

У другім месцы гэтага-ж артыкулу мы гаворым: «Тав. Горын, аўтар артыкулу, не разумее, што паварот нашае палітыкі ў бок ліквідацыі кулацтва, як клясы, адбываецца, на падставе суцэльнае калектывізацыі, не разумее, такім чынам, розьніцы паміж старой і новай палітыкай партыі, пераносіць гэты лёзунг на ўвесь Саюз, г. зн. і на раёны, дзе няма яшчэ суцэльнае калектывізацыі». З прычыны таго, што гэтае месца («пераносіць гэты лёзунг на ўвесь Саюз») можа стварыць ураженьне, што генэральны лёзунг—лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, не зьяўляецца генэральным лёзунгам **для ўсёй краіны,** можа стварыць ураженьне аб мэханічным падзеле сфэр дзейнасьці гэтых лёзунгаў,—гэта фармулёўка памылковая. Зусім відавочна, што нашы падкрэсьліваньні існуючае розьніцы паміж раёнамі суцэльнае калектывізацыі і раёнамі, дзе яшчэ няма суцэльнае калектывізацыі, мелі сваёй мэтай зусім правільнае завастрэньне ўвагі членаў партыі на неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы супроць тых, хто ня зьяўляе правядзеньня лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, з працэсам суцэльнай калектывізацыі і гэтым самым тэарытычна апраўдвае адміністраваньне з аднаго боку і затрыманьне тэмпаў калектывізацыі з другога боку. У «Правде» ад 27-га лютага (№ 57) мы чытаем: «Патрабаваньне перанясеньня лёзунгу ліквідацыі кулацтва на раёны бяз суцэльнае калектывізацыі, з аднаго боку, «значала-б падмяніць палітыку абагуленьня ў калгасах канфіскаванае кулацкае маемасьці палітыкай дазыбы гэтае маемасьці для асабістага ўзбагачэньня паасобных сялян» (Сталін), значала-б голае раскулачваньне бяз сувязі з калектывізацыяй, а з другога, значала-б тое-ж супраціўленьне працэсу калектывізацыі, але выяўленае ў другой форме».

Трэба рашуча падкрэсьліць, што раскулачваньне ня зьнімае яшчэ пытаньня клясавай барацьбы, што праблема «хто каго?» ня зьнімаецца яшчэ правядзеньнем раскулачваньня. Раскулачваньне зьяўляецца першай стадыяй ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, і было-б вялізнай, непамернай на сваёй шкоднасьці, апартуністычнай памылкай меркаваць, што раскулачваньне зьяўляецца заключным актам у ліквідацыі кулацтва. Такая ўстаноўка можа толькі спрыяць дэмабілізацыі мас, усыпляе пільнасьць іх у барацьбе з клясавым ворагам.

Партыя, праводзячы цьвёрда і рашуча палітыку ліквідацыі кулацтва, як клясы, будзе біць таксама і па злачынным апартунізьме, які прыкрываецца «левай» фразай, а па сутнасьці які зрывае справу калектывізацыі і грае на руку клясаваму ворагу. Замацаваць занятыя пазыцыі, ухаліцца за галоўнае зьвяно (арцель), бязьлітасна змагацца з клясавым ворагам, цьвёрда і без хістаньня праводзіць палітыку ліквідацыі кулацтва, як клясы, — гэта значыць пераможна рухацца наперад.

